МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ СТУДЭНТАЎ

Гісторыя гэтага дня пачынаецца трагічна і велічна ў залітай крывёй Празе ў тыя часы, калі рабства і забойствы захліснулі ўсю Еўропу, калі правы чалавека і яго годнасць былі растаптаны, калі кожны кавалачак хлеба, праглынуты на каленях, рабіўся горкім. У агні вайны і ў жахах акупацыі ішоў 1939 год.

«На досвітку 17 лістапада,—успамінае тыя змрочныя дні былы пражскі студэнт,—мяне разбудзіў аглушальны шум у інтэрнаце. Выбіўшы дзверы, няпрошаныя госці пракладвалі сабе шлях у пакоі студэнтаў прыкладамі. Я выглянуў у акно і ў цёмным дварэ ўбачыў сілуэты ўзброеных да зубоў эсэсаўскіх наймітаў. Яны старанна абшуквалі ўсе куткі».

Рыхтавалася расправа з будучыняй чэшскай культуры—студэнтамі, якія ўзнялі свой голас пратэсту супраць тэрору, здзекаў і зняваг. У двор казармы фашысты сагналі тры тысячы студэнтаў і патрабавалі ад іх выдачы арганізатараў сходак і дэманстрацый. Але гры тысячы чалавек маўчалі, як адзін. Пахмурымі былі іх твары, змрочным было неба перад світаннем. Не дачакаўшыся адказу, фашысты выхапілі з натоўпу дзевяць студэнтаў і тут-жа, на вачах сяброў і таварышаў, расстралялі іх.

Узышло сонца. Кроплі гарачай крыві герояў, як іскры, успыхнулі ў яго праменнях і запалілі многа смелых сэрцаў ва ўсім свеце прагай бітвы за свабоду, запалілі пажар вялікай барацьбы з акупантамі. У гэтай барацьбе гартавалася адзінства студэнтаў усяго свету.

«Як добра памірaць з надзеяй на лепшую будучыню ўсяго чалавецтва!»—усклікнуў у свой апошні час 19-гадовы студэнт з Браціславы Яраслаў Ондрушэк.

«Я не пахіснуся!»—гэтыя гордыя словы кінуў у твар сваім катам венскі студэнт Вальтэр Кэмпф.

«Маё жыццё было цудоўным,—пісала перад смерцю сваім сябрам чэшская студэнтка Марыя Кудзерыкава.—Яно было страсным, поўным давер'я да людзей, поўным барацьбы і перамог... Больш за ўсё я хачу, каб вы адчувалі прыгажосць жыцця, прыгажосць яго дароў!»

«Жыццё будзе цудоўным!»—прарочыў французскі студэнт, кавалер Ганаровага Легіёна П'ер Бенуа, пакідаючы жыццё з песняй на вуснах.

І ажыццяўляючы жаданні тых, хто змагаўся і загінуў у барацьбе за перамогу ідэалаў свабоды, роўнасці і братэрства людзей усіх краін, студэнты з розных куткоў зямнога шара сабраліся ў разгар вайны ў Лондане і абвясцілі ўсяму свету:

«Мы, студэнты Вялікабрытаніі, усіх яе дамініёнаў, Поўночнай і Поўднёвай Амерыкі, СССР, Бельгіі, Чэхаславакіі, Францыі, Грэцыі, Кітая, Нідэрландаў, Нарвегіі, Польшчы, Югаславіі, разам з усімі свабадалюбівымі народамі ўшаноўваем памяць расстраляных чэхаславацкіх студэнтаў. Восенню 1939 года яны першымі падалі сігнал да масавага выступлення супраць фашысцкіх захопнікаў. Вось чаму мы абвяшчаем 17 лістапада Міжнародным днём студэнтаў».

Быў заснаваны Міжнародны Саюз Студэнтаў, які ў сваім Статуце адной з асноўных задач паставіў «дабівацца таго, каб дасягненні ў галіне навукі і культуры сталі здабыткам усіх людзей і выкарыстоўваліся ў інтарэсах чалавецтва і міру ва ўсім свеце».

Прайшлі гады. Закончылася вайна. Пакаленне студэнтаў, якія прышлі ва універсітэцкія аўдыторыі проста з франтоў другой сусветнай вайны, ужо закончыла сваю вучобу. На змену яму прышло новае студэнцкае пакаленне, якое бярэ прыклад з сваіх папярэднікаў і не аслабляе барацьбы за мір і дружбу студэнтаў усіх краін.

І вось ужо шэсць мільёнаў юнакоў і дзяўчат больш чым з 70 краін аб'яднаны ў Міжнародны Саюз Студэнтаў. У іх ліку і мы, студэнты Совецкага Саюза.

Ад нашых сяброў нас аддзяляюць тысячы кілометраў, прасторы акіянаў і кантынентаў. Мы—людзі розных рас. Адны з нас вучацца ва універсітэтах з багатай і слаўнай гісторыяй і векавымі традыцыямі, другія ўвайшлі ў толькі што адчыненыя нацыянальныя універсітэты, першыя ў гісторыі народа, і традыцыі іх толькі выпрацоўваюцца. Нас падзяляюць час і звычаі—у адных навучальны год толькі што пачынаецца, у другіх—ужо гадавыя экзамены.

Але студэнтаў аб'ядноўвае галоўнае—імкненне да свабоднага, мірнага, шчаслівага жыцця, бо хто-ж тады вызначаецца радасцю жыцця, калі не студэнты! Аб'ядноўвае студэнтаў агульнае імкненне да ведаў, да светлых вышынь навукі і культуры. Мільёны студэнтаў усіх краін зямнога шара патрабуюць міру і шчасця і горача вераць у тое, што мір будзе ўстаноўлен на ўсёй зямлі на многія гады, што моладзь будзе спакойна вучыцца і працаваць.

Жыццё будзе цудоўным!

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 25 (237) | Пятніца, 18 лістапада 1955 года | Цана 20 кап.

На семінарскіх занятках

Арганізавана праходзяць семінарскія заняткі па асновах марксізма-ленінізма ў студэнтаў першага курса гістарычнага факультэта. Першакурснікі актыўна выступаюць на іх, правільна тлумачаць тыя або іншыя палажэнні з твораў класікаў марксізма-ленінізма.

Асабліва актыўна выступаюць Марат Напрэеў, Фелікс Налівайка, Маргарыта Раманава, Рая Мірончыкава і іншыя.

Не горш праходзяць у гісторыкаў і семінарскія заняткі па гісторыі СССР.

І. СІДАРЭНКА,
студэнт І курса гістарычнага факультэта.

ВЕЧАР ДРУЖБЫ

«Вечар дружбы» — так назвалі студэнты першага курса філалагічнага факультэта нядаўна прайшоўшую сустрэчу са студэнтамі трэцяга курса аддзялення рускай мовы і літаратуры. Сустрэча была арганізавана па ініцыятыве старшакурснікаў і прайшла вельмі цікава. Трэцякурснікі тт. Нечай, Буглак, Зімак і іншыя расказалі аб сваёй вучобе ва універсітэце, параілі, як лепш рыхтавацца да практычных і семінарскіх заняткаў, залікаў і экзаменаў. Асабліва цяпер, калі ў нас на курсе прайшло некалькі семінарскіх заняткаў, парады нашых старшых таварышаў былі вельмі карыснымі. Мы ўдзячны нашым таварышам і жадаем, каб такія сустрэчы праводзіліся часцей.

Ф. МАЙСЕЙШЫН,
студэнт І курса філфака.

ЦІКАВАЯ ЛЕКЦЫЯ

Нядаўна адбылася лекцыя на тэму: «Жыццё і дзейнасць Нікалая Аляксеевіча Астроўскага». Яе прачытаў маскоўскі прафесар тав. Трэгуб, які асабіста быў з ім знаёмы.

З цікавасцю праслухала лекцыю вялікая колькасць студэнтаў. Прысутныя былі вельмі задаволены і дзякавалі лектару.

І. ШКЛОЎСКІ.

ПАСЯДЖЭННЕ НАВУКОВАГА СЕМІНАРА

Днямі адбылося пасяджэнне навуковага семінара выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў хімічнага факультэта.

Прысутныя абмеркавалі даклад дацэнта А. С. Баркана аб выніках праходзіўшай у гэтым годзе ў Маскве II-ой усесаюзнай нарады па фізіка-хімічнаму аналізу. На семінары было вырашана ўзмацніць ролю кафедр у распрацоўцы тэхналогіі атрымання калійных угнаенняў з месцанараджэнняў, адкрытых у Беларусі.

П. УЛАДЗІМІРАЎ.

Вялікая, непахісная дружба звязвае совецкіх і польскіх юнакоў і дзяўчат. Вось і ў гэтым годзе БДУ радасна прыняў пасланцаў з брацкай Польшчы. Яны разам з беларускімі студэнтамі вучацца і адпачываюць.

На здымку: студэнты-палякі Ш. Раманчук, В. Паўлоўская, Л. Філіпік и Н. Мукасей.

Перапіска студэнтаў нашага універсітэта са студэнтамі Чэхаславакіі, Японіі і Індыі—выдатны сімвал дружбы і адзінства студэнтаў розных краін. Ніжэй мы змяшчаем лісты чэшскай студэнткі Ганкі Гоушкавай да нашай студэнткі Святланы Кліменценка і адказ беларускай студэнткі Лілі Цунскай на ліст Мінэо Каяма з Японіі.

ГАНКА ГОУШКАВА — СВЯТЛАНЕ КЛІМЕНЦЕНКА

... Святлана, ты пішаш, што я добра ведаю вашу рускую мову. Гэта няпраўда, бо ў мяне многа памылак.

Мне прыкра, што я яшчэ не ведаю добра мову нашага вызваліцеля.

Я часта ўспамінаю Совецкую Армію, якая нас вызваліла ад капіталістаў і фашыстаў. Мне было тады восем год. І мне ўжо не трэба было хадзіць у нямецкую школу, дзе мы павінны былі гаварыць толькі па-нямецку.

Пасля вызвалення ў нас дома жылі разам з намі два рускія салдаты—Пётр Іванавіч і Валодзя. Якія яны былі добрыя! Яны навучылі мяне спяваць совецкія песні...

Цяпер я вучуся ў Педагагічным інстытуце. Праз год вучобы стану настаўніцай у пачатковай школе, а потым — у сярэдняй. Я многа думаю аб будучай рабоце па выхаванню дзяцей. Спачатку будзе цяжка. Няма чалавека, які-б дабіўся вялікіх поспехаў адразу. Да поспехаў і перамогі вядзе вялікая сіла і ўпорства. Так, дарагая Света? У нашай арганізацыі ЧСМ я працую піонерважатай ужо тры гады. Спачатку я працавала з чэшскімі піонерамі, а калі ў Чэхаславакію прыехалі карэйскія дзеці, камітэт ЧСМ перадаў іх мне. У маім атрадзе 40 піонераў — хлопчыкі і дзяўчаткі. У іх няма бацькоў, і яны завуць мяне «мама» па-чэшску, або па-карэйску «омоні». Я — маладая мама, вось!

Найвялікшае табе дзякуй, Святлана, за «Кнігу важатага». Яна мне дапаможа ў выхаванні піонераў.

... Майскія дні — 1 і 9 мая— я правяла ў нашай сталіцы — Празе. Было многа весялосці і радасці—святкавалі 10-ю гадавіну нашага вызвалення Совецкай Арміяй.

... 21 мая я была на выступленні Ансамбля песні і танца імя Александрава, і якое было шчасце, калі пасля выступлення я сустрэлася з некаторымі членамі ансамбля. Спачатку я не магла гаварыць ад радасці, але таварышы мне дапамаглі, і потым мы гаварылі, як сябры. А як яны добра спявалі і танцавалі...

... Мілая Света! У нас таксама экзамены. Я ўжо здала чэшскую мову, рускую і карэйскую мовы, гісторыю, матэматыку і фізкультуру — усё на 5 і 4.

... Святлана, гэта вялікае шчасце для мяне, што я магу перапісвацца з табой, Насцяй і Сашам. Мяне вельмі многаму навучыла перапіска з вамі. Святланачка мая, напішы мне, калі ласка, ці многа памылак? Крытыкуй мяне, не бойся!

Света, я нядаўна атрымала ад Сашы кнігу на беларускай мове і чытала яе. Я-б хацела пазнаёміцца з тваёй роднай мовай і таксама хоць трохі яе вывучыць. Гэта можна зрабіць?

С комсомольским приветом
Ганка из Чехословакии

ЛІЛЯ ЦУНСКАЯ—МІНЭО КАЯМА

Дарагі Мінэо Каяма!

Я з прыемнасцю даю адказ на Ваша пісьмо. Вы добра гаворыце аб дружбе паміж людзьмі ўсіх нацый, якія ставяць сваёй мэтай захаванне міру. Мы з гатоўнасцю працягваем Вам руку дружбы, бо перад намі стаяць агульныя задачы—адстаяць на зямлі мір.

Я вучуся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя В. І. Леніна на трэцім курсе юрыдычнага факультэта; таксама вывучаю законы, каб выхоўваць людзей у духу любві і адданасці сваёй радзіме, каб прадухіліць парушэнне гэтых законаў, каб не дапусціць замахаў на соцыялістычныя асновы грамадства.

Нашы студэнты захапляюцца спортам, спевамі, танцамі, музыкай,—што каму больш падабаецца. Для гэтага ў нас ва універсітэце служаць розныя гурткі мастацкай самадзейнасці.

Нашы інтарэсы вельмі разнастайныя. Мы, акрамя вывучэння навук, аддаем сябе грамадскай рабоце, спорту і іншым цікавым, карысным мерапрыемствам, якія праводзяцца ва універсітэце.

Я таксама жыву і вучуся ў сталіцы Совецкай Беларусі—Мінску. Гэта вельмі прыгожы горад. Разбураны ў час вайны, ён хутка вырас з руін. І не адзін толькі Мінск так хутка адбудаваўся—у нас выраслі сотні новых гарадоў, магутных электрастанцый, заводаў, фабрык, што з'яўляецца адным з неабмежаваных доказаў міралюбівых мэт совецкага народа. Мір—гэта жыццё, а жыццё ў нашай краіне—шчасце.

Вас цікавяць адносіны паміж мужчынам і жанчынай у нашай краіне. Я адкажу Вам.

Усе адносіны паміж мужчынам і жанчынай у нас будуюцца на аснове поўнай роўнасці. Доказам гэтага з'яўляецца тая вялікая роля, якую совецкая жанчына займае ў грамадскім, дзяржаўным і культурным жыцці краіны. Але без задавальнення пачуцця любві, без шчасця мацярынства і бацькоўства жыццё чалавека не можа быць поўным, таму і ўступаюць дзве свабодныя і роўнапраўныя асобы ў шлюб, заснаваны на ўзаемнай прыхільнасці, сапраўднай любві і павазе.

З свайго боку, мяне вельмі цікавіць Ваша жыццё. Я і ўсе студэнты нашага універсітэта будзем вельмі ўдзячны Вам за ўстаноўленую паміж намі перапіску. Шлем гарачае прывітанне дружбы.

З павагай да Вас—
Ліля ЦУНСКАЯ.

НЕДАХОПЫ ПРОФСАЮЗНАЙ РАБОТЫ—ПАД АГОНЬ КРЫТЫКІ

(з XV профсаюзнай канферэнцыі БДУ)

* * *

ГАВОРАЦЬ ДЭЛЕГАТЫ

* * *

У гэтым годзе ў корпусе «Б» вырашылі адкрыць пральню. У памяшканне, прызначанае для гэтай мэты, занеслі... 4 лавы і 4 карыты для мыцця бялізны і на гэтым спыніліся. Да гэтага часу ніхто не можа дадумацца, дзе ўзяць для пральні цёплую ваду. А пакуль гаспадарнікі думаюць, 700 студэнтаў не ведаюць, як памыць бялізну.

У інтэрнаце ёсць многа незашклёных вакон. Аднак прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы т. Бярэзін нават і не думае адпускаць шкло для гэтай справы.

Дрэнна наладжана і дзяжурства ў інтэрнаце. Сюды без перашкод часта пранікаюць незнаёмыя людзі ў п'яным выглядзе, расхаджваюць па паверхах, узнімаюць шум. А зусім нядаўна на другі паверх прышла цыганка і пачала гадаць студэнтам.

Падобныя факты выклікаюць трывогу і гавораць аб тым, што прафком слаба цікавіўся бытам студэнтаў, а гэта-ж яго першаступенная задача.

(З выступлення дэлегата тав. Мікуліка).

* * *

Адказныя за правядзенне палітінфармацый у групах мала цікавіліся тым, як праходзяць гэтыя інфармацыі. Справядлівы папрок тут трэба зрабіць дэканату філфака, які вылучыў адказных выкладчыкаў, але не кантраляваў іх работы ў групах.

Хацелася-б, каб часцей ва універсітэце чыталіся лекцыі аб жыцці выдатных людзей, напрыклад такія, як нядаўна праведзеная лекцыя аб жыцці і творчасці Н. Астроўскага. Пажадана, каб кафедры, падрыхтоўваючы дыспут або лекцыі, прыцягвалі да ўдзелу ў іх больш актыўных і добра падрыхтаваных выкладчыкаў.

(З выступлення дэлегата тав. Рапановіча).

* * *

У гэтым навучальным годзе ў корпусе юрфака займаюцца два факультэты: юрыдычны і гістарычны. Для паспяховай работы гурткоў мастацкай самадзейнасці на гэтых факультэтах неабходна мець штатнага культмасавіка. Прафком-жа і прауленне клуба нават і не падумалі зацікавіцца гэтым пытаннем.

Нездавальняюча працуе буфет у корпусе юрфака. У ім няма нават прадуктаў першай неабходнасці. Было вырашана ўстанавіць у буфеце кіпяцільнік, каб забяспечыць студэнтаў чаем. Аднак прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы т. Бярэзін ніяк не адважыцца вылучыць неабходную суму грошай на гэтую справу.

У інтэрнаце, дзе жывуць юрысты, няма пакоя адпачынку. Студэнты не маюць магчымасці культурна правесці свой вольны час, у многіх пакоях нават няма рэпрадуктараў.

Новы склад прафкома павінен у бліжэйшыя дні вырашыць гэтыя пытанні.

(З выступлення старшыні профбюро юрыдычнага факультэта тав. Платонава).

* * *

Дэканаты не ўдзяляюць патрэбнай увагі студэнтам. Вучэбныя планы складаюцца без удзелу студэнцтва. Таму атрымліваецца так: 2 лістапада на IV курсе заняткі цягнуліся 13 гадзін, а на другі дзень—толькі 4. Пры такой планіроўцы не можа быць добра засвоен прадмет, не можа быць нармальнага правядзення заняткаў.

І гэта не адзіны прыклад такіх адносін да студэнтаў.

Студэнт V курса Авечкін праходзіў практыку ў Крывым Рогу, стыпендыю перад ад'ездам ён не атрымаў, двойчы звяртаўся ў дэканат, але апошні застаўся нямым. Няма ўвагі і да студэнтаў-дыпломнікаў пры размеркаванні на практыку, дзе кожны павінен сабраць патрэбны для работы матэрыял.

Трэба праяўляць больш увагі да чалавека!

(З выступлення старшыні профбюро геафака тав. Гурскага).

* * *

Вельмі важным пытаннем з'яўляецца сувязь прафкома з профсаюзнымі бюро факультэтаў у працэсе работы. У сувязі з гэтым хочацца сказаць, што на пасяджэннях прафкома вельмі мала ўвагі ўдзялялася думкам старшынь профбюро. Усе пытанні прафком часта імкнуўся вырашаць сам.

Яшчэ недастаткова ўдзяляецца ўвагі такім «дробязям», што сустракаюцца ва універсітэце, як няправільнае расходванне паліва кубаўшчыцамі, адсутнасць графінаў у інтэрнатах і г. д. Усе гэтыя «дробязі» парушаюць агульны рытм жыцця і вучобы студэнтаў. На біястанцыі, якая знаходзіцца паблізу аўтазавода, да гэтага часу няма электрычнасці, вадаправода. Усё гэта можна зрабіць, калі толькі прафком і адміністрацыя універсітэта будуць працаваць больш аператыўна.

(З выступлення т. Шыдлоўскага, старшыні профбюро біяфака).

ВУЧОБУ І ДЫСЦЫПЛІНУ—У ЦЭНТР УВАГІ

(З даклада старшыні прафкома тав. Марчанка).

У сваім дакладзе старшыня прафкома тав. Марчанка адзначыў, што важнейшым абавязкам кожнага студэнта з'яўляецца настойлівае, сістэматычнае авалоданне ведамі, павышэнне ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню, каб стаць сапраўды высокакваліфікаваным совецкім спецыялістам. У нас створаны для гэтага ўсе неабходныя ўмовы.

Профсаюзная арганізацыя універсітэта ў справаздачным годзе пытанні павышэння паспяховасці і ўмацавання вучэбнай дысцыпліны ставіла ў цэнтр увагі. Паводзіны асобных студэнтаў былі прадметам абмеркавання на пасяджэннях прафкома, бюро і групавых сходах. Побач з выхаваўчай работай да злосных парушальнікаў дысцыпліны былі прыняты сур'ёзныя меры ўздзеяння. За сістэматычныя пропускі заняткаў некалькі студэнтаў былі выключаны з універсітэта, а такія студэнты, як Жарскі (аддзяленне журналістыкі), Філістовіч (філфак), Седліцкі (геафак) і інш., пазбаўлены месца ў інтэрнаце.

—Недахопаў, — гаворыць далей дакладчык, — было-б значна менш, калі-б прафком і, у першую чаргу, адказны за вучэбную работу т. Кавалёў працавалі больш аператыўна, прыцягвалі да работы актыў,ведалі становішча ў групах, цікавіліся работай акадэмічных сектараў у профбюро.

Вялікае значэнне ў фарміраванні самастойных навыкаў працы мае навукова-даследчая работа. У 1954 — 55 навучальным годзе навукова-даследчай работай было ахоплена каля 1200 студэнтаў, якія прадставілі 442 дакклады. 216 даследаванняў студэнтаў было прадстаўлена на гарадскі агляд студэнцкіх работ. З іх 101 работа была аднесена да 1-й катэгорыі.

За гэтымі дасягненнямі нельга не бачыць і сур'ёзных недахопаў. На аддзяленні матэматыкі навукова - даследчай работай займаюцца адзінкі. На гарадскі агляд тут прапанавана толькі 9 работ, 8 з якіх напісаны студэнтамі V курса.

Дрэнна працавалі гурткі праф. Накоўніка і дацэнтаў Самадурава, Бірала, Баранавай і інш. Прафком, аднак, не прыняў належных мер па наладжванню работы ва ўсіх гуртках, мала цікавіўся работай Совета СНТ.

Дакладчык спыніўся на недахопах у палітыка-выхаваўчай рабоце, нізкі ўзровень якой прывёў да таго, што сталі наглядацца амаральныя ўчынкі сярод студэнтаў.

У дакладзе былі таксама ўскрыты недахопы ў рабоце шматтыражнай газеты, у галіне культурна-масавай і спартыўнай работы. Тав. Марчанка крытыкаваў шэфскі сектар, які нездавальняюча праводзіў работу сярод калгаснікаў. Дакладчык падрабязна спыніўся на характарыстыцы жыллёва-бытавых умоў студэнтаў.

ГЭТА НАША АГУЛЬНАЯ СПРАВА

(З даклада старшыні касы ўзаемадапамогі тав. Драгунова).

Каса ўзаемадапамогі пры прафкоме БДУ працуе многа гадоў. За гэты перыяд часу яна аказала вялікую дапамогу студэнтам.

Мяркуючы па грашоваму абароту касы, можна прыйсці да высновы, што цяпер мы поўнасцю можам забяспечыць студэнтаў грашовымі пазыкамі. Але гэта, нажаль, далёка не так. Бываюць выпадкі, калі даводзіцца адмаўляць студэнтам у выдачы пазык па той прычыне, што ў касе не аказваецца грошай. У чым-жа справа?

Выбранае ў маі гэтага года прауленне прыняло касу ў вельмі дрэнным становішчы. Членскія ўзносы ў большасці не былі сабраны за 5 і больш месяцаў. Была вялікая колькасць студэнтаў, якія на працягу некалькіх год не пагашалі пазык. Усё гэта прывяло да таго, што 15 тысяч рублёў фактычна аказаліся мёртвай сумай.

У выніку праведзеных мерапрыемстваў работа касы ўзаемадапамогі некалькі ажывілася. Але недахопаў усё-ж ёсць яшчэ вельмі многа. Існуючая ў нас сістэма подпісаў абходных лістоў часта выконваецца фармальна. Прауленне касы некалькі разоў звярталася ў рэктарат з просьбай, каб без подпісу і пячаткі касы ўзаемадапамогі ў абходных лістах ні ў якім разе не праводзіць разлік студэнтаў-выпускнікоў. Але просьба наша не была задаволена. У бухгалтэрыі ў гэтым годзе былі разлічаны 14 студэнтаў, якія маюць запазычанасць у касе ўзаемадапамогі.

АЖЫВІЦЬ РАБОТУ ПРАЎЛЕННЯ КЛУБА

(З даклада старшыні праўлення клуба тав. Герасіменкі).

Галоўная ўвага ў рабоце праўлення клуба была звернута на паляпшэнне работы калектываў мастацкай самадзейнасці, на падрыхтоўку да Усесаюзнага агляду самадзейнасці профсаюзаў, на правядзенне змястоўных факультэцкіх вечароў, на культурна-масавае абслугоўванне студэнтаў і работнікаў універсітэта.

У гэтым годзе ў універсітэце працавалі такія калектывы мастацкай самадзейнасці, як хор (кіраўнік І. Я. Кліонскі), тэатральны калектыў (кіраўнік К. Л. Рутштэйн), харэаграфічны (кіраўнік Л. К. Алексютовіч) і многія іншыя.

У нас слабая дысцыпліна сярод удзельнікаў універсітэцкіх гурткоў мастацкай самадзейнасці. Рэпетыцыі калектываў у нас праходзяць як быццам-бы і рэгулярна, аднак на іх сёння прысутнічаюць адны людзі, заўтра — другія. Таму якасць рэпетыцый значна зніжаецца. Камітэт комсамола і прафком павінны наладзіць дысцыпліну ў калектывах.

Сур'ёзнага паляпшэння патрабуе работа нашай факультэцкай самадзейнасці. Прайшоўшы універсітэцкі агляд самадзейнасці паказаў, што на факультэтах работа гурткоў носіць кампанейскі характар.

Неабходна ўдзяляць больш увагі арганізацыі і правядзенню факультэцкіх і курсавых вечароў, на якіх мы можам ахапіць усіх нашых студэнтаў. Задача факультэцкіх і грамадскіх арганізацый заключаецца ў тым, каб гэтыя вечары былі цікавымі, каб ад іх студэнтам была карысць.

З РАШЭННЯЎ КАНФЕРЭНЦЫІ

*** Прафкому асноўную ўвагу ў сваёй рабоце накіраваць на аказанне дапамогі рэктарату, партыйнаму камітэту ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных, палітычна пісьменных спецыялістаў для народнай гаспадаркі нашай Радзімы.**

*** Профсаюзным бюро факультэтаў больш увагі ўдзяляць пытанням вучэбна-выхаваўчай практыкі студэнтаў. Узмацніць сувязь студэнтаў з вытворчасцю і школамі.**

*** Стварыць у групах нецярпімыя ўмовы для парушальнікаў працоўнай дысцыпліны і гультаёў.**

*** Карэнным чынам перабудаваць палітыка-выхаваўчую работу сярод студэнтаў, палепшыць якасць лекцыйнай прапаганды, палітыка-выхаваўчую работу ў калектывах мастацкай самадзейнасці і спартыўных секцыях.**

*** Стварыць шырокі аўтарскі актыў для рэдакцыі газеты універсітэта. Шырэй асвятляць у друку пытанні быту, культуры студэнтаў.**

ГАВОРАЦЬ ДЭЛЕГАТЫ

* * *

Вучоба студэнтаў—галоўнае, чым паўсядзённа павінна займацца профсаюзная арганізацыя універсітэта. Прафком-жа недастаткова ўдзяляў увагі гэтаму найважнейшаму пытанню. Вялікая колькасць прапушчаных без уважлівых прычын лекцый, тое, што многія студэнты ў мінулым навучальным годзе атрымалі дрэнныя адзнакі, яскрава сведчыць аб яўных недахопах у рабоце акадэмічных сектараў прафкома і профсаюзных бюро факультэтаў. Трэба не выпускаць з поля зроку кожнага студэнта, працаваць з адстаючымі не тады, калі яны правальваюць сесіі, а з самага пачатку навучальнага года.

Навукова-даследчай работай ва універсітэце займаецца толькі палова ўсіх студэнтаў. Вынікі навукова-даследчай работы многіх студэнтаў зусім нізкія. Гэта таксама павінна турбаваць прафком.

Сярод студэнтаў універсітэта маюць месца выпадкі п'янства і крадзяжу. Гэта з'яўляецца вынікам таго, што прафком не папярэджвае дрэнных учынкаў, не спыняе іх на першых кроках, а займаецца разглядам персанальных спраў толькі тады, калі студэнт дакаціўся да крайнасці. Выкараніць гэтую заганную практыку—задача грамадскіх арганізацый.

(З выступлення старшыні БРК тав. Ахрамовіча).

* * *

Не менш важным з'яўляецца пытанне аб быце студэнтаў. Было вырашана правесці конкурс на лепшы пакой у інтэрнаце. Правялі гэты конкурс, праверылі. Вызначылі лепшыя пакоі, а ўзнагародзіць іх няма чым. І ўсе нашы спробы атрымаць у прафкоме прэміі не мелі поспеху.

Да гэтага часу ў наш пакой адпачынку не прыходзіць ні адна газета. Ёсць радыёла, але няма пласцінак. Шмат разоў мы звярталіся і ў прафком, і да тав. Бярэзіна з гэтым пытаннем, і заўсёды атрымлівалі адмоўны адказ. Проста не хочацца верыць, што так бяздушна могуць адносіцца да запатрабаванняў студэнтаў нашы кіраўнікі.

(З выступлення дэлегата тав. Плашчынскай).

* * *

Хочацца сказаць аб тым, як у нас ідзе падрыхтоўка дыпломных работ. Для таго, каб напісаць добрую дыпломную работу, патрэбны добрыя ўмовы. Нажаль, яны пакуль што дрэнныя. Для правядзення доследаў у нас няма нават такой простай хімічнай пасуды, як колбы, варонкі і т. п. Нам чытаюць лекцыі аб новых метадах даследаванняў, аб новых пробах, а мы да сённяшняга дня не бачым гэтага ў сябе. Каб выпусціць добрага спецыяліста, трэба вучыць яго па-сучаснаму. Прафком вельмі і вельмі мала клапоціцца аб гэтым. Трэба звярнуць вялікую ўвагу на справу размеркавання выпускнікоў універсітэта. На працягу пяці год вучобы ў універсітэце студэнты па-рознаму адносяцца да вучобы, грамадскай работы. Таму неабходна пры размеркаванні выпускнікоў улічваць гэта і прадастаўляць большае права выбару тым, хто добра вучыўся і быў добрым грамадскім актывістам.

Прафком не павінен заставацца ў баку ад гэтай важнай справы.

(З выступлення дэлегата тав. Сталярова)

* * *

Недастаткова вялася работа па паляпшэнню якасці насценных газет факультэтаў. Студэнты самі не заўсёды спраўляліся з работай, а кіраўніцтва і дапамогі ім з боку прафкома не было. Не былі арганізаваны інструктаж, лекцыі для студкораў, абмен вопытам рэдкалегій насценгазет.

Не зжыты фармалізм і ў размеркаванні інтэрнатаў. Невядома, напрыклад, чаму прафком пасяліў першыя курсы на Нямізе, адарваўшы іх ад старшакурснікаў.

Трэба адзначыць, што ён наогул не праяўляе ініцыятывы ў пошуках форм работы, дзейнічае па шаблону. А пры жаданні такія формы можна знайсці.

Карысна было-б неяк па-новаму весці барацьбу за дысцыпліну. Нядрэнна было-б арганізаваць графік наведвання заняткаў па факультэтах з улікам наведвання па тыднях і арганізаваць грамадскую думку вакол іх.

Трэба адзначыць і той факт, што часта нашы студэнты ходзяць на лекцыі ў верхняй вопратцы. Таму неабходна прафкому сумесна з камендантамі карпусоў арганізаваць дзяжурства і не дапускаць падобных з'яў.

Назіраюцца ў універсітэце выпадкі псавання мэблі, безгаспадарчых адносін да грамадскай маёмасці. Для барацьбы з гэтым можна было-б пераняць вопыт Чарнавіцкага універсітэта. Там студэнты арганізавалі дзяжурствы ў аудыторыях і перадавалі іх чыстымі ад групы групе. Гэта садзейнічала таму, што ў аудыторыях заўсёды быў парадак. Шэфства студэнтаў над мэбляй праводзілася пад лозунгам «Чыстата аудыторыі—справа гонару групы».

(З выступлення тав. Палілава, сакратара партбюро біяфака).

ГЛЫБОКА ВЫВУЧАЦЬ І ВЫДАТНА ВЕДАЦЬ ЗАМЕЖНУЮ МОВУ!

★ ★ ★

З шматгадовага вопыту

Работа над замежнай літаратурай з'яўляецца неад'емнай часткай паўсядзённай працы даследчыкаў прыроды ўсіх спецыяльнасцей. Гаворка ідзе ў асноўным не аб кнігах, у якіх з большым або меншым спазненнем абагульняюцца найгалоўнейшыя поспехі прыродазнаўства, а аб артыкулах у навуковых часопісах, у працах навуковых таварыстваў і ў іншых данных, у якіх публікуюцца арыгінальныя навуковыя работы, матэрыял, атрыманы ў выніку пастаўленых экспериментаў або праведзеных назіранняў. Важна не толькі пазнаёміцца з вывадамі аўтара, але і з яго канкрэтнымі данымі, што дае магчымасць крытычна аднесціся да вывадаў і вырашыць, наколькі яны абгрунтаваныя і пераканаўчыя.

Нярэдка апублікаваныя ў літаратуры канкрэтныя даныя могуць быць карыснымі для вырашэння зусім не тых пытанняў, дзеля якіх яны былі атрыманы аўтарамі. Напрыклад, доўгі час, распрацоўваючы пытанне аб залежнасці інтэнсіўнасці абмену ад памераў цела ў розных прадстаўнікоў жывёльнага свету, я сабраў апублікаваныя ў навуковай літаратуры розных краін вынікі вымярэнняў хуткасці абмену ў розных рыб, якія праводзіліся з самымі рознымі мэтамі, большай часткай зусім не звязанымі з цікавячым мяне пытаннем. Пасля апрацоўкі сабранага разгорнутага лічбовага матэрыялу, з прымяненнем патрэбных у такіх выпадках статыстычных метадаў, высветлілася пэўная заканамерная залежнасць узроўню абмену ў рыб ад вагі цела, якая можа быць выражана простым ураўненнем і выкарыстана для разлікаў запатрабаванняў рыб, што мае вялікую тэарэтычную і практычную цікавасць. Відавочна, што без скарыстання літаратурных даных гэтая мэта не магла-б быць дасягнута, бо я ніяк не змог-бы правесці многія тысячы вызначэнняў абмену ў самых розных марскіх і прэснаводных рыб, якія разводзяцца ў розных частках свету.

З гэтага прыкладу відаць, наколькі сістэматычная работа са спецыяльнай замежнай літаратурай павялічвае магчымасці даследавання. Пры абавязковай умове крытычнага і творчага выкарыстання даных замежнай літаратуры, што патрабуе пэўных навыкаў і вопыту, у большай меры пашыраецца кругагляд і павышаецца эфектыўнасць навуковай работы.

Праф. Г. ВІНБЕРГ.

Міністр вышэйшай адукацыі СССР падпісаў загад «Аб паляпшэнні выкладання замежных моў у вышэйшых навучальных установах».

Мэтай навучання мове на I і II курсах як устанаўлівае загад, з'яўляецца падрыхтоўка студэнта да работы над замежным тэкстам і выкарыстання атрыманых ведаў для самастойнага чытання і перакладу арыгінальнай замежнай літаратуры па спецыяльнасці на старшых курсах.

Міністр указаў на неабходнасць павысіць патрабаванні да студэнтаў па вывучэнню замежных моў: не дапускаць дубліравання курса замежнай мовы ў ВНУ з курсамі сярэдняй школы, сістэматычна праводзіць масавыя мерапрыемствы, якія-б садзейнічалі авалодванню замежнай мовай (гурткі анатаванне замежнай літаратуры, выпуск насценгазет і г. д).

Добры дапаможнік

З першых дзён занятка ў ва універсітэце я пачала вывучаць нямецкую мову. Рэгулярныя заняткі і вопытныя педагогі дапамаглі мне добра авалодаць ёй. Распрацоўваючы тое ці іншае пытанне, я выкарыстоўвала даныя замежнай, у прыватнасці нямецкай тэхнічнай літаратуры.

Нямецкая тэхнічная літаратура мае багаты матэрыял па арганічнай хіміі. І, пераходзячы да выканання дыпломнай работы, я таксама буду выкарыстоўваць нямецкую літаратуру.

Л. НЕАКЛАДНАВА.

ЗБРОЯ ДАСЛЕДЧЫКА

Часта даводзіцца чуць скаргі некаторых студэнтаў на тое, што замежная мова забірае вельмі многа каштоўнага часу, будучы зусім непатрэбнай для тых, хто не збіраецца рабіць яе сваёй спецыяльнасцю.

Падобныя адносіны да моў зусім неапраўданы. Такое маё перакананне, заснаванае на ўласным вопыце. Са страхам думаю, як цяжка было-б мне працаваць над дысертацыяй, як цяжка было-б прадаўжаць свае самастойныя даследчыя работы цяпер, пасля абароны дысертацыі, калі-б я, будучы студэнтам, заразіўся гэтым поглядам ад некаторых сваіх аднакурснікаў. І вельмі часта шкадаваў, што ў студэнцкія гады, калі было больш вольнага часу, не вывучаў акрамя англійскай і нямецкай мовы яшчэ і французскую. Веданне гэтых трох замежных моў, на якіх выдаецца большая частка замежнай літаратуры і, у першую чаргу, англійскай мовы, хаця-б уменне перакладаць спецыяльную літаратуру, значна аблягчае працу ўсякага даследчыка, які займаецца прыродазнаўчымі навукамі. Для эксперыментатара веданне замежных моў не менш неабходна, чым уменне тонка і дакладна праводзіць эксперымент.

З таго часу, як я пачаў займацца навуковай работай, амаль кожны дзень даводзіцца штонебудзь чытаць на англійскай або нямецкай мовах.

Ці можна спадзявацца на што-небудзь новае ў навуцы, калі не ведаеш усяго таго, што адбываецца ў ёй па цікавячаму цябе пытанню. А вельмі многае рабілася і робіцца зарубежнымі вучонымі. І таму даследчык, які не ведае замежных моў, і не знаёмы з усёй літаратурай па пытанню, якім ён займаецца, у большасці выпадкаў не можа лічыцца поўнацэнным даследчыкам: ён або часта ламаецца ў адкрытыя дзверы, вывучаючы тое, што ўжо вывучана, або не здольны праявіць у рабоце сваёй ініцыятывы, будучы вымушаным выконваць пераважна чужыя парады.

Хочацца думаць, што загад Міністэрства вышэйшай адукацыі аб мерах па паляпшэнню выкладання замежных моў у вышэйшай школе будзе выконвацца ў нас не проста фармальна, што кафедра замежных моў пастараецца знайсці спосабы дабіцца таго, каб кожны выпускнік універсітэта ведаў замежную мову хаця-б у такой ступені, каб чытаць без слоўніка тэксты па спецыяльнасці. Вялікую карысць аказала-б павышэнне патрабавальнасці на экзаменах па замежнай мове да паступаючых у аспірантуру. У аспіранта-ж і без замежных моў работы вельмі многа. І таму для яго вельмі карысна ў першую чаргу набыць веды па замежных мовах.

Не думаю, што ўзмацненне патрабаванняў да вывучэння замежных моў можа аказацца цяжарам для студэнтаў. Калі павялічыць час, які яны прысвячаюць заняткам па гэтаму прадмету, усяго толькі ўдвая, ды яшчэ выкарыстаць яго больш рацыянальна, то бадай, гэтага будзе зусім дастаткова для даволі глыбокага вывучэння мовы.

В. СВІРЫДАЎ,
кандыдат хімічных навук.

Авалодваю французскай мовай

Калісьці, будучы яшчэ вучаніцай сярэдняй школы, я ўпершыню пачула ад настаўніка незнаёмыя словы, няўмела паўтарыла іх. Незнаёмымі і загадкавымі былі для мяне і старонкі падручніка па французскай мове. Здавалася, ніколі нельга будзе даведацца, аб чым апавядаюць яны.

Аднак за гады вучобы ў школе я навучылася чытаць, разумець і перакладаць французскія тэксты, карыстаючыся слоўнікам. Паступіўшы ў універсітэт, я вырашыла яшчэ глыбей вывучаць французскую мову, каб добра авалодаць ёй. Веданне яе для нас, будучых настаўнікаў, вельмі важна.

На французскай мове напісана многа цікавых прац па філалогіі, на гэтай мове пісалі свае творы Бальзак і Вальтэр, Ралан і Арагон, Поль Элюар і Жан Лафіт. Пры чытанні твораў гэтых пісьменнікаў у арыгінале атрымліваеш вялікае эстэтычнае задавальненне.

Для таго, каб дабіцца свабоднага валодання замежнай мовай, я вырашыла займацца вывучэннем яе кожны дзень. Для сістэматызацыі самастойных заняткаў я вывучала мову па праграме інстытута замежных моў.

У мэтах авалодання вуснай мовай неабходна пастаянна актывізаваць лексіку вывучаемай мовы. Таму я часта раблю перакказы прачытанага тэксту, практыкуюся ў перафразаванні доўгіх і складаных па канструкцыі і лексіцы сказаў.

Засваенню мовы вельмі дапамагае вывучэнне лексічных і граматычных каментарыяў, якія даюцца пасля кожнага тэксту.

У сучасны момант я чытаю «Кнігу для чытання на французскай мове». Яна дапаможа мне глыбей засвоіць мову.

І. ЛУШЧЫЦКАЯ,
студэнтка II курса філалагічнага факультэта.

На здымку: студэнтка З. Курыленка чытае газету Дэмакратычнай Германіі.

Коратка

Бібліятэка і кафедры універсітэта рыхтуюць вечар, прысвечаны месячніку совецка-германскай дружбы. На вечары з дакладам аб прагрэсіўнай нямецкай літаратуры выступіць загадчык кафедрай зарубежнай літаратуры, дацэнт Д. Е. Фактаровіч.

Група студэнтаў пад кіраўніцтвам загадчыка кафедрай нямецкай і французскай моў Е. А. Мацісон рыхтуе мастацкае выкананне нізкі вершаў сучасных нямецкіх паэтаў.

Старшы бібліятэкар О. Л. Ніканава прачытае бібліяграфічны агляд «Нямецкая навуковая літаратура ў фондах бібліятэкі БДУ імя В. І. Леніна».

* * *

Бібліятэкай нашага універсітэта нядаўна атрыман з Масквы зборнік «Некаторыя пытанні засваення граматыкі замежных моў», які выдадзены кафедрай замежных моў Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС. У зборнік уключаны артыкулы: «Выяўленне граматычных катэгорый вывучаемай мовы», «Ужыванне і значэнне склонаў у сучаснай нямецкай мове», «Некаторыя пытанні методыкі работы над кан'юнктывам у нямецкай мове».

Вывучаць мову паўсядзённа, сістэматычна

Ліпеньскі пленум ЦК КПСС паставіў перад совецкім народам задачы па ўздыму прамысловасці, тэхнічнаму прагрэсу і паляпшэнню арганізацыі вытворчасці.

Для далейшага развіцця совецкай навукі і тэхнікі нашай краіны перад вышэйшай школай стаяць складаныя задачы — даць краіне адукаваных людзей, кваліфікаваных спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі і культуры. Аднак не можа быць адукаванага чалавека і добрага спецыяліста без ведання замежных моў.

Замежная мова з'яўляецца адной з асноў агульнай адукацыі, мае вялікае выхаваўчае, асветнае і практычнае значэнне. Яна з'яўляецца часткай агульнай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў і садзейнічае паглыбленню тэарэтычных ведаў і ўзняццю агульнай культуры.

Наша партыя і ўрад удзяляюць вялікую ўвагу навуцы і вышэйшай адукацыі. У нас, у Совецкім Саюзе, шырока распаўсюджана вывучэнне замежных моў: створана вялікая колькасць факультэтаў і інстытутаў замежных моў. Замежная мова вывучаецца ва ўсіх школах і ВНУ; але як у школе, так і ў ВНУ некаторыя навучэнцы не ўсведамляюць неабходнасці ведання замежнай мовы, адносяцца фармальна, лічаць яе другарадным прадметам. На заліках і экзаменах часамі даводзіцца чуць недапушчальныя заўвагі: «Пастаўце «4», не магу-ж я з-за нейкай там замежнай мовы пакідаць універсітэт або страціць стыпендыю». Такія словы можна пачуць ад студэнта Малашка (1 курс фізіка-матэматычнага факультэта) і некаторых іншых.

Гэта сведчыць аб недастатковай патрабавальнасці да сябе і аб нізкай культуры студэнта.

Як вядома, у нас, ва універсітэце, замежная мова з'яўляецца агульнаадукацыйным прадметам і зусім роўнапраўным з любой вучэбнай дысцыплінай. На вывучэнне яе ў нас адводзіцца значна больш гадзін, чым у якімнебудзь іншым інстытуце, а іменна 272 гадзіны на I і II курсах, 136 гадзін на III і IV курсах. Такім чынам, пры сур'ёзных адносінах навучэнцаў да прадмета, пры пастаяннай сістэматычнай рабоце над мовай, пры пэўнай школьнай падрыхтоўцы зусім дасягальна тая мэта, да якой мы імкнемся, а іменна: авалодаць замежнай мовай так, каб самастойна чытаць літаратуру па сваёй спецыяльнасці і грамадска-палітычную, а таксама разумець нескладаную гаворку.

Яркі прыклад магчымасці дасягнуць гэтага падаюць нашы аспіранты тт. Свірыдаў, Апелінская, Міцкевіч, Окунь, Прыма, Курбатава, Куневіч, Дзержановіч, Казел, Салескі і многія іншыя. Гэтыя таварышы авалодалі мовай настолькі, што свабодна карыстаюцца замежнай літаратурай па сваёй спецыяльнасці пры рабоце над дысертацыяй.

Але вось на першых-жа занятках нам, выкладчыкам, становіцца зразумелым, што ў асобных абітурыентаў, якія паступілі на I курс, няма належнай падрыхтоўкі, яны не разумеюць гаворкі выкладчыка на замежнай мове, граматыку ведаюць у адрыве ад мовы, не могуць адказаць на замежнай мове на самае прымітыўнае пытанне. У выніку гэтага многія студэнты звязваюць свае няўдачы з непераадольнымі цяжкасцямі ў гэтай справе. Але гэта, зразумела, не так. Часамі не заўсёды правільная арганізацыя вучэбнага працэсу ў школе, адсутнасць своечасовай дапамогі студэнту, несур'ёзныя адносіны сам-іх навучэнцаў да мовы прывялі да адставання па гэтаму прадмету.

Як вядома, пры вывучэнні замежнай мовы невялікія хібы ў ведах раней вывучаемага матэрыялу робяць немагчымым паспяховы рух уперад, таму патрабуецца сістэматычная, свядомая, паўсядзённая работа над мовай. Калі студэнт з першых-жа заняткаў прымаецца сур'ёзна за работу, выконвае ўсе заданні, услухоўваецца ў мову выкладчыка, самастойна апрацоўвае ўвесь матэрыял у аўдыторыі і дома, то з упэўненасцю можна сказаць, што ён авалодае мовай у тым аб'ёме, які патрабуецца, а іменна, перакладаць з дапамогай слоўніка літаратуру па спецыяльнасці.

Работа над перакладам—цяжкая работа, але зусім ажыццявімая. Пераклад, аднак, не павінен зводзіцца да замены слоў замежнай мовы адпаведнымі словамі роднай. Навучэнцы перш за ўсё павінны звярнуць увагу на тое, што адно рускае слова перакладаецца некалькімі замежнымі і наадварот, на важнасць службовых слоў у сказе, на граматычны аналіз слова, каб знайсці яго ў словніку, і, нарэшце, на фразеалагічныя абароты, якія не могуць быць перакладзены даслоўна, бо іх даслоўны пераклад прыводзіць да недакладнага разумення і часта скажае змест. Пераклад павінен быць дакладнай перадачай сказанага на адной мове словамі другой мовы. Ён павінен дакладна перадаць змест тэксту з усімі яго сэнсавымі адценнямі. Рускі пераклад павінен «гучэць па-рускі», г. зн. не мець у сабе зваротаў, не ўласцівых літаратурнай мове.

Паўтараю, работа гэта нялёгкая, яна патрабуе безумоўнага ведання граматыкі—марфалогіі і сінтаксісу, запасу слоў, умення хутка і правільна знайсці патрэбнае слова або фразеалагічны зварот.

Вялікім недахопам у нашай рабоце з'яўляецца тое, што многія студэнты I курса не прадаўжаюць вывучэння замежнай мовы, якой займаліся ў школе, а, разлічваючы на больш лёгкую работу, пачынаюць у ВНУ вывучаць іншую. Такім чынам, замест таго, каб паглыбляць свае веды, яны пачынаюць з азоў і, натуральна, за параўнаўча невялікую колькасць гадзін не могуць авалодаць новай мовай і забываюць тую, якую вывучалі ў школе.

У сучасны момант, пры нашых цяперашніх сувязях з загранічай у галіне навукі, культуры, спорту, гандлю, пры частых наведваннях замежных краін і прыёме ў сябе замежных гасцей, неабходна, асабліва моладзі, ведаць хаця-б адну замежную мову, каб не аказацца ў ролі чалавека «без языка». Вельмі непрыемна быць у кампаніі і нічога не разумець, не ўмець адказаць або самому задаць пытанне.

Загад Міністра вышэйшай адукацыі за № 953 ад 21 верасня 1955 г. аб паляпшэнні пастаноўкі выкладання замежных моў у вышэйшай школе яшчэ раз падкрэслівае, якое важнае значэнне надаецца ў сучасны момант вывучэнню замежных моў.

Дык давайце-ж з усёй сур'ёзнасцю возьмемся за работу! Будзем працаваць сістэматычна, свядома і добрасумленна.

Е. А. МАЦІСОН,
заг. кафедрай французскай і нямецкай моў.

ВЯЛІКІ РУСКІ ФІЗІЁЛАГ

(ДА 50-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ І. М. СЕЧЭНАВА)

У гісторыі рускай і сусветнай навукі Івану Міхайлавічу Сечэнаву належыць пачэснае месца. Ён па справядлівасці лічыцца заснавальнікам фізіялогіі ў Расіі. І. М. Сечэнаў з'яўляўся не толькі эксперыментатарам, але і праніклівым мысліцелем, ён стварыў фізіялагічныя асновы паслядоўнага матэрыялістычнага светапогляду.

Пасля сканчэння ў 1848 годзе Галоўнага ваенна-інжынернага вучылішча І. М. Сечэнаў быў накіраван на ваенную службу ў сапёрны полк, які дыслакаваўся ў ваколіцах Кіева.

Скончыўшы універсітэт, І. М. Сечэнаў павышае сваю падрыхтоўку ў лабараторыях выдатных фізіёлагаў таго часу. На працягу 1856—1860 гадоў Сечэнаў авалодвае ў лабараторыях Людвіга, Дзюбуа-Рэймона і іншых вучоных багаццем тэарэтычных ведаў і эксперыментальных метадаў, якія былі накоплены сусветнай навукай. У гэты-ж перыяд ён закончыў сваё першае эксперыментальнае даследаванне і напісаў дысертацыю на тэму: «Матэрыялы для будучай фізіялогіі алкагольнага атручэння».

У лютым 1860 года І. М. Сечэнаў вярнуўся на радзіму і пасля паспяховай абароны дысертацыі быў прызначан ад'юнктам па кафедры фізіялогіі Медыка-хірургічнай акадэміі (цяпер Ваенна-медыцынская акадэмія).

За кароткі тэрмін І. М. Сечэнаў стварыў выдатна абсталяваную фізіялагічную лабараторыю, у якой закіпела творчая дзейнасць вучонага і яго вучняў.

Дзейнасць І. М. Сечэнава як даследчыка была надзвычай разнастайнай. Ён пакінуў у розных галінах фізіялогіі яркі след. Але пераважную ўвагу вучоны сканцэнтраваў на глыбокім вывучэнні дзейнасці галаўнога і спіннога мозгу, на даследаванні газавага саставу крыві і газаабмену паміж крывёю і лёгачным паветрам.

Даследаванні, прысвечаныя вывучэнню законаў, якія кіруюць паглынаннем газаў крывёй, з'яўляюцца асновай многіх сучасных уяўленняў аб біяхімічных працэсах, што адбываюцца ў крыві.

У 1861 годзе малады вучоны зрабіў выдатнае адкрыццё, якое да нашых дзён вызначае напрамак даследаванняў не толькі ў нашых айчынных лабараторыях, але і ў лабараторыях многіх краін свету. Сечэнаў выявіў, што галаўны мозг пры сваім узбуджэнні можа рабіць тармозячы ўплыў на спінны мозг, прыгнятаючы або нават зусім спыняючы яго актыўнасць.

Вялікі вучоны са здзіўляючай праніклівасцю раскрыў глыбокі сэнс названага адкрыцця не толькі для фізіялогіі, але і для псіхалогіі і матэрыялістычнай філасофіі.

Сваё глыбокае паслядоўна-матэрыялістычнае разуменне псіхічных з'яў І. М. Сечэнаў выклаў у вядомым трактаце «Спроба ўнесці фізіялагічныя асновы ў псіхічныя працэсы». Па цэнзурных умовах гэтая праца была апублікавана пад змененым загалоўкам «Рэфлексы галаўнога мозгу» (1963 г.). Акадэмік І. П. Паўлаў назваў гэтае даследаванне геніяльным узлётам рускай навуковай думкі.

Імя Сечэнава стала сімвалам філасофскага светапогляду эпохі 60-х і наступных гадоў. Побач з Герцэнам, Чэрнышэўскім, Пісарэвым і Дабралюбавым І. М. Сечэнаў стаў уладаром дум перадавога дэмакратычнага грамадства. У мастацкіх вобразах Яўгенія Базарава (раман Тургенева «Бацькі і дзеці») і Кірсанава (раман Чэрнышэўскага «Што рабіць?») паказан уплыў вялікага вучонага і мысліцеля на моладзь той эпохі.

Кніга Сечэнава стала маніфестам матэрыялістычнага светапогляду для перадавога рускага грамадства і выклікала жорсткія праследаванні з боку царскіх улад. На кнігу быў накладзен арышт, супраць аўтара заведзена судовая справа. А мітрапаліт пецербургскі ўнёс прапанову саслаць Сечэнава за «предерзостное, душепогубное и вредоносное учение» ў Салавецкі манастыр.

Сечэнаву належыць многа капітальных адкрыццяў па фізіялогіі галаўнога і спіннога мозгу.

У газетным артыкуле немагчыма пералічыць усе буйнейшыя адкрыцці заснавальніка айчыннай фізіялогіі. Спіс яго навуковых прац мае каля 100 назваў, у ліку якіх ёсць даследаванні па псіхалогіі і па тэорыі пазнання.

І. М. Сечэнаў меў многа вучняў у Медыка-хірургічнай акадэміі і ў трох універсітэтах—Пецербургскім, Одэскім і Маскоўскім. Ён выхаваў плеяду выдатных вучоных, якія развівалі яго адкрыцці. У ліку вучняў Сечэнава—акадэмік Краўкоў, прафесары Введзенскі, Верыга, Тарханаў, Салазкін, Шатэрнікаў, Самойлаў.

Шырока разгорнутыя цяпер у айчынных і зарубежных лабараторыях даследаванні электрычных токаў галаўнога мозгу ідуць па шляху, які адкрыў Сечэнаў. Вялікі вучоны паклаў таксама пачатак даследаванням у галіне фізіялогіі працы і авіяцыйнай фізіялогіі. Рознабаковыя даследаванні дзейнасці ўнутраных органаў пачуццяў, якія праводзіць акадэмік К. М. Быкаў і яго школа, таксама грунтуюцца на ідэях Сечэнава.

Яго навуковае супрацоўніцтва са славутым рускім клініцыстам урачом С. П. Боткіным дало яму магчымасць закласці асновы напрамку ў фізіялагічнай навуцы, які пазней пачаў называцца нервізмам.

Ідэі нервізма шырока выкарыстоўваюцца савецкімі вучонымі як пры распрацоўцы тэарэтычных праблем, так і пры вырашэнні практычных задач аховы здароўя.

Да апошніх год свайго жыцця Сечэнаў аддаваў многа энергіі шырокай папулярызацыі прыродазнаўства. Ужо ва ўзросце 75 год ён з захапленнем чытаў лекцыі для рабочых у Маскве, на Прэчысценскіх курсах, пакуль не быў адхілен ад гэтай грамадскай працы грубым распараджэннем царскіх улад. Сечэнаў быў палымяным прыхільнікам увядзення вышэйшай адукацыі для жанчын. Першыя рускія жанчыны, якія прысвяцілі сябе вывучэнню медыцыны ў Медыка-хірургічнай акадэміі, знайшлі ў асобе вялікага даследчыка прыроды свайго настаўніка і друга. Сечэнаў быў адным з ініцыятараў стварэння і нязменным лектарам Бестужаўскіх вышэйшых жаночых курсаў у Пецербургу.

Совецкі народ і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва з глыбокай удзячнасцю ўшаноўваюць светлую памяць І. М. Сечэнава. Вялікі рускі вучоны дарагі і блізкі нам сваімі выдатнымі заслугамі перад навукай, самаадданым служэннем народу.

Праф. Г. ЮН'ЕЎ.

ПЕРШАЯ ЭСТАФЕТА

У нядзелю ля біякорпуса быў дадзен старт першай эстафеты, у якой прынялі ўдзел каманда лёгкаатлетаў і дзве каманды лыжнікаў.

Эстафета праходзіла на дварэ і скверы універсітэта.

Уся дыстанцыя, даўжыня якой больш за 10 кілометраў была разбіта на 10 розных этапаў.

«... На старт! Увагаў Марш!»— ... Першыя спартсмены бягуць з эстафетнымі палачкамі. Ім прадстаіць самы вялікі этап—больш за 2 кілометры. Вось паказваецца прадстаўнік першай каманды лыжнікаў. Ён перадае эстафету свайму таварышу па камандзе. Лідыруюць лыжнікі. Але намаганнямі спартсменаў-лёгкаатлетаў Кійранена, Кліцунова, Зігмантовіча уперад выходзіць каманда лёгкаатлетаў. Пад апладысменты сабраўшыхся гледачоў і ўдзельнікаў першым перасякае лінію фінішу лёгкаатлет В. Ціток, які бег апошні этап. Крыху пазней прышлі к фінішу і астатнія ўдзельнікі эстафеты.

Пасля спаборніцтва галоўны суддзя В. Г. Кушнароў уручыў пераможцам пераходны кубак. Час пераможцаў—35 мінут 22 секунды.

Трэба, каб правядзенне эстафеты зрабілася традыцыйным і каб у ёй прымалі ўдзел каманды ўсіх факультэтаў, а не толькі лёгкаатлеты і лыжнікі.

А. СПІРЫДОНАЎ.

Універсітэцкі Вожык



І ГЭТАК БЫВАЕ

На актывах і сходах крытыкуюць прагульшчыкаў і разгільдзяяў, якія пры гэтым ніколі не прысутнічаюць. (З даклада).



Бывало кот курченка жрал,
А повар вслух его ругал.
Теперь изменены порядки—
У Васек нервы стали шатки:
Чтоб глас кухмистерский сердитый
Им не испортил аппетита –
Они несут на двор цыплёнка
И там жуют его в сторонке,
А простофили в наши дни
Уж разглагольствуют одни.
И слышат умные советы
Одни кухонные предметы.

Немало наших активистов
Подобны этим моралистам.

„А ВОЗ І ЗАРАЗ ТАМ..."

Пытанне аб адкрыцці пральні і душаў у інтэрнатах марынуецца ўжо два гады. (Са справаздачнага даклада).

* * *

Смотреть
нельзя
без слёз:
Профкомовцы —
лица в поту,
Вздымают
о бане вопрос
На должную высоту!
И вот он
торчит там,
В отчетах,
пиком горным,
Как памятник
делам
языкотворным.

ЛЯВОНІХА ПА-АФРЫКАНСКУ

Удзельнікі танцавальнага калектыва часта не маюць касцюмаў для выступленняў. (З выступлення т. Герасіменкі).

А прафком танцкалектыў не палюбіў,
І касцюмаў для артыстаў не купіў.

Проникнет маг или факир.
Беда, когда в спортивный мир

Паспрабуй купі

У буфетах інтэрнатаў і універсітэцкай сталовай прадаюцца вельмі дарагія блюды.
(З даклада).

— *Вазьмі з'еш гуся.*
— *А ён маю стыпендыю не з'есць?*

Рэдактар А. ВОЛК.

А Б ' Я В А

АДКРЫТА ПАДПІСКА

НА ГАЗЕТЫ І ЧАСОПІСЫ

КРАІН НАРОДНАЙ ДЭМАКРАТЫІ

З каталагам гэтых выданняў можна пазнаёміцца ў камітэце комсамола універсітэта штодзённа з 11 да 18 гадзін.

Афармленне падпіскі праводзіцца аддзелам «Саюздруку» толькі да 1 снежня 1955 г.

КАМІТЭТ ЛКСМБ.

АТ 06748 Мінск. Друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Зак. 741. Тыр. 2 000.